**Райчонак, С.** Марыў пра неба з дзяцінства / С. Райчонак // Кліч Радзімы (Шаркаўшчына). — 2021. — 10 крас. — С. 3.

**МАРЫЎ ПРА НЕБА З ДЗЯЦІНСТВА**



*Глядзеў ён у неба і верыў,*
*Што некалі стане пілотам.*
*І даль неабсяжную, марыў,*
*«Разрэжа» вінтом верталёта.*

З самага дзяцінства ў Іосіфа Курыловіча была мара звязаць свой лёс з небам, з авіяцыяй. А каб яе ажыццявіць, пасля школы ён закончыў курсы ў Віцебскім вучэбным авіяцыйным цэнтры ДТСААФ, рыхтаваўся стаць пілотам верталёта.

– Потым была вучоба ў Сызранскім вышэйшым ваенным авіяцыйным вучылішчы лётчыкаў, – кажа Іосіф Вітальевіч. – А ўдасканальваць практычныя навыкі давялося ў Беларускай ваеннай акрузе ў пасёлку Засімавічы пад Пружанамі. Было гэта роўна 30 год назад.

У снежні 1979 года ў Рэспубліку Афганістан быў тэрмінова ўведзены абмежаваны кантынгент савецкіх войск. Тады яшчэ ніхто нават не ўяўляў, што «неаб’яўленая» афганская вайна будзе доўжыцца дзесяць год. Не ведаў тады і лейтэнант Іосіф Курыловіч, што праз год пасля службы на Брэстчыне вайсковае камандаванне накіруе частку афіцэрскага і асабовага складу авіябазы для выканання інтэрнацыянальнага абавязку ў Афганістан. Сярод тых, хто адправіўся ў «гарачую кропку», быў і ён – пілот верталёта Мі-24.

Спачатку была вучэбная часць, дзе лётчыкі атрымлівалі навыкі палётаў у гарыстай мясцовасці. Затым аэрадром Джэлалабада назаўсёды ўпісаўся ў біяграфію нашага земляка незабыўнай старонкай.

– Верталёт у складаных і спецыфічных умовах вядзення вайны ў гарыстай мясцовасці з’яўляўся важнай стратэгічнай адзінкай, – тлумачыць Іосіф Вітальевіч. – Мы на сваіх машынах вялі пошук варожых караванаў, знішчалі іх, суправаджалі транспартныя верталёты і аўтакалоны, наносілі бомбава-штурмавыя ўдары, праводзілі разведку і дэсантаванне жывой сілы.

Фактарамі рызыкі для нас былі складаныя ўмовы пілатавання, пастаянныя абстрэлы з зямлі. У маёй памяці назаўсёды застаўся выпадак, калі экіпаж верталёта Мі-8, які вывозіў раненых з поля бою, не пакінуў падбіты верталёт, а загінуў у палаючай машыне.

На асабістым рахунку Іосіфа Курыловіча 260 баявых вылетаў (400 гадзін у небе). Баявыя дзеянні сталі сапраўдным выпрабаваннем для савецкіх байцоў: высокая тэмпература паветра, экстрэмальныя ўмовы, вялікая фізічная і псіхалагічная нагрузкі.

– Самым складаным перыядам у Афганістане былі першы і апошні месяцы службы, – кажа Іосіф Вітальевіч. – У самым пачатку ты яшчэ не ўяўляеш, наколькі гэта жудасна – ваяваць, страляць па людзях, хоць і ведаеш, што яны ворагі. А напрыканцы знаходжання ў «гарачай кропцы» табой авалодвае пачуццё страху: да заканчэння службы застаюцца лічаныя дні, але, на жаль, яны могуць стаць апошнімі ў жыцці.

У жніўні 1983 года Іосіф Курыловіч вяртаецца ў Пружаны. Ад вайсковага камандавання атрымлівае медаль «За баявыя заслугі» і Ганаровую грамату Вярхоўнага Савета СССР. Затым быў курс лячэння ў шпіталі, пасля якога ўрачы вынеслі вердыкт: да лётнай службы не прыгодны. Таму старшаму лейтэнанту Іосіфу Курыловічу прыйшлося змяніць ваенны мундзір на цывільны касцюм. Цяпер ён працуе ў дарожна-будаўнічым упраўленні № 26 нашага гарадскога пасёлка.

Жыццё зямное ідзе сваёй хадой, але звязанае з небам мінулае ніколі не памеркне ў душы.

**Сяргей РАЙЧОНАК.**